.

# ЛІЦВІНСКІ ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ЦЫРЫМАНІЯЛ У КАНЦЫ XV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.: СПРОБА РЭКАНСТРУКЦЫІ

**МІКАЛАЕВА Л.В.**

КАНДЫДАТ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ДАЦЭНТ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІНФАРМАТЫКІ І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ
Г. МІНСК, БЕЛАРУСЬ

Дыпламатычныя адносіны з іншымі суб’ектамі знешнепалітычнай дзейнасці з’яўляліся традыцыйнай формай ажыццяўлення знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) вызначанага перыяду. На практыцы прымяняліся розныя дыпламатычныя метады: пасольскія візіты, перамовы (палітычныя і дыпламатычныя), падрыхтоўка і заключэнне ў асноўным двухбаковых пагадненняў, дыпламатычная перапіска, пасрэдніцтвы (медыяцыі), подкуп (“упамінкі”), шлюбныя саюзы, шантаж і г.д. [5, с. 41]. Асноўныя прынцыпы і мэты ажыццяўлення і кіравання знешняй палітыкай ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст. знайшлі сваё замацаванне ў важнейшых тагачасных заканадаўчых актах [5, с. 40]. Аднак для забеспячэння спрыяльных дыпламатычных адносін акрамя міжнародна-прававых норм важным было і выкананне пэўных цырыманіяльных звычаяў і правіл.

Найважнейшымі крыніцамі ў вывучэнні названых пытанняў з’яўляюцца пасольскія кнігі, якія вяліся і ў ВКЛ, і ў Вялікім Княстве Маскоўскім [ 6; 7]. Гэта актавыя матэрыялы, прысвечаныя перш за ўсё дыпламатычнай дзейнасці дзяржаў, абмену дыпламатычнамі місіямі, прыёму пасольстваў і г.д. Яны ўтрымліваюць дакуметы, што характарызуюць знешнепалітычную дзейнасць дзяржаў: тэксты мірных дагавораў, перамірныя граматы, афіцыйныя граматы (лісты) манархаў, пасольскія інструкцыі і інш. Ход дыпламатычных перамоў, адлюстраваны ў пасольскіх кнігах (а там часта закранаецца і іх нефармальны бок) дае базу для аналізу як працэсуальнага боку маючыхся дыскусій, так і пратакольных і цырыманіяльных момантаў.

Трэба адзначыць, што небагатыя і фрагментарныя дадзеныя маскоўскіх пасольскіх кніг (у “Метрыцы” ВКЛ такіх звестак не захавалася) дазваляюць намаляваць толькі абагуленую схему ліцвінскага дыпламатычнага цырыманіяла, які выконваўся ў дачыненні да дыпламатычных прадстаўнікоў Вялікага Княства Маскоўскага. Звестак аб тым, што гэты ж цырыманіял выконваўся і пры сустрэчы дыпламатычных агентаў іншых дзяржаў, мы не маем. Пры гэтым трэба заўважыць, што калі дзеянні адбываліся ў Вільні, то ў дыпламатычным пратаколе прыкметныя некаторыя элементы падабенства з маскоўскім цырыманіялам.

Библиотека БГУИР

У першую чаргу адзначым, што дыпламатычнаму пратаколу і цырыманіялу пры перамовах надавалася значная ўвага. Нават дробнае іх парушэнне магло нанесці страшэнную шкоду і сапсаваць перспектывы паспяховага завяршэння дыпламатычнай місіі.

Так як пра прыезд паслоў у ВКЛ ведалі дачасна, бо на іх пасылаліся “апасныя” (ахоўныя) лісты, то звычайна на мяжы іх сустракаў ліцвінскі прыстаў, які са сваёй камандай суправаджаў паслоў амаль да самай Вільні, забяспечваючы ім праезд, харчаванне і бяспеку [6, с. 142]. Некалькі не даязджаючы да Вільні паслоў сустракаў вялікі прыстаў, адзін з членаў Рады, які суправаджаў іх у сталіцу. Па дарозе насустрач маглі выязджаць маршалкі і дваране. Пры сустрэчы вялікі прыстаў вітаў паслоў ад імя гаспадара і пытаўся пра здароўе. Адначасова пaслы і сустракаючыя сыходзілі з коней. Пры гэтым маскоўскія паслы не рабілі гэта першымі і злазілі з коней толькі тады, калі сустракаючыя ўжо сышлі [4, с. 31–33]. Пасля гэтага яны накіроўваліся на месца прызначэння і станавіліся на падвор’е. Маскоўскія пасольствы ў Вільні, як і ліцвінскія ў Маскве, ахоўвалі прыстаў і яго каманда, якія сачылі, каб паслы не ўступалі ў зносіны з насельніцтвам, бо ў пасольскай світе часам былі і шпегі. Падчас напружаных адносінаў паміж дзяржавамі за пасламі сачылі настолькі жорстка, што нават не пускалі ў царкву [7, с. 61].

З паведамленнем аб прызначанай аудыенцыі да паслоў на падвор’е прыязджалі гаспадарскія маршалкі. Яны ж арганізоўвалі сустрэчу паслоў “на дворе, на сенехъ... да на переходехъ” [6, с. 142; 7, с. 60–61].

Прыём у вялікага князя пачынаўся з таго, што паслы “правілі” паклон ад свайго ўладара. Затым гаспадар пытаў паслоў пра здароўе вялікага князя маскоўскага, даваў ім цалаваць руку і прапаноўваў сесці. Пры гэтым пасадцы на лаве надавалася важнае значэнне, бо размяшчэнне ззаду або ніжэй за іншыя пасольскія дэлегацыі прыніжала статус пасольства. Таму маскоўскі бок пільна сачыў, каб падобных выпадкаў не было, што часам выклікала цырыманіяльныя канфлікты.

Некалькі пасядзеўшы, паслы пачыналі “поминки явити”, раздача якіх часам адбывалася па спіску ў “памяти” [6, с. 415]. Бывалі выпадкі, калі ліцвінскі бок не задавальнялі прывезеныя падарункі. Тады іх вярталі паслам, як напрыклад, у 1554 г., калі ліцвінскім і польскім дыпламатам (апошнія ўдзельнічалі таму, што маскоўскае пасольства прыехала на тэрыторыю Польшчы, у Люблін, дзе знаходзіўся кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст) не спадабаўся склад і стан падарункаў, прадстаўленых маскоўскімі пасламі: гэта былі “кубки, кречеты и бубны”. Да таго ж крэчаты (птушкі з роду сокалаў) аказаліся хворымі і з іх ніводнага не было чырвонага колеру, што, напэўна, вельмі цанілася. Адмова ад падарункаў азначала няветлівае стаўленне прымаючага боку да пасольства. Магчыма, тым самым падкрэслівалася, што падданыя Жыгімонта Аўгуста ўсведамляюць нявыгаднае становішча маскоўскага боку, яго большую зацікаўленасць у заключэнні перамір’я [7, с. 441].

Аднак падарункі вазілі не заўсёды, калі іх не было – паслы адразу давалі “верыцельную” грамату. “Речи” паслы казалі часам гаспадару сам-

Библиотека БГУИР

насам, часам у прысутнасці паноў Рады ў залежнасці ад важнасці пытання. “Жалабныя” (“обидные”) спіскі падаваліся пасля “речи”. Часам прыёмы ў гаспадара адбываліся па некалькі разоў [6, с. 749]. Пасля першай сустрэчы паслоў клікалі да стала, пасля чаго маршалкі суправаджалі іх на падвор’е [6, с. 142; 7, с. 60–61].

Акрамя афіцыйнага прыёма ў гаспадара, былі прыёмы, дзе абмяркоўваліся пастаўленыя пасламі пытанні. На іх перамовы з пасламі праводзілі прадстаўнікі Рады, звычайна тыя ж асобы, што ездзілі з пасольствам у Маскву непасрэдна перад прыездам замежных паслоў. Яны ж перадавалі гаспадару прамовы паслоў, а паслам – словы гаспадара. На цырымоніі крыжацалавання гаспадар прамаўляў словы абавязацельства выконваць дамову, пасля чаго цалаваў крыж на грамаце, да якой была прывешана дзяржаўная пячатка [5, с. 44].

Апошні прыём у гаспадара называўся “отпуск”. На ім гаспадар стоячы развітваўся з пасламі, перадаваў паклон іх уладару, абяцаў прыслаць з адказам свайго пасла і даваў цалаваць руку на развітанне. Пазней паслам пачалі даваць пісьмовы адказ. Без апошняга прыёма паслы не маглі ад’ехаць. На ім гаспадар указваў ім шлях руху і даваў праважатага [3, с. 309]. Пасля адбываліся ганаровыя провады да таго месца, дзе іх сустракалі. Адтуль яны ехалі да мяжы з прыставам.

Калі сустрэчы з гаспадаром адбываліся ў Кракаве, то падобны цырыманіял паўтараўся і там. Адрозненне складала тое, што ў Кароне прыставамі былі палякі. Прадстаўнікі кароннай Рады таксама ўваходзілі і ў кола тых асоб, якія вялі перамовы з пасламі. Як і ў Вільні, гэтымі асобамі звычайна былі члены ліцвінскіх пасольстваў у Маскву, што папярэднічалі прыездам маскоўскіх дыпламатычных прадстаўнікоў. Тое, што ў перамовах з ліцвінскага боку зноў бралі ўдзел тыя ж самыя асобы, тлумачыцца фактам атрымання імі “мандатаў”, якімі ажыццяўлялася ўнутрыдзяржаўнае ўзаканенне вялікіх пасольстваў і іх паўнамоцтваў на заключэнне міжнароднай дамовы [5, с. 44]. У якасці адрознення можна таксама назваць тое, што пры знаходжанні ў Кракаве крыніцы радзей паведамляюць пра наладжаныя “встречи” для паслоў па шляху на аудыенцыю [6, с. 667–670, 749–750; 2, с. 197–198]. Апошняе маскоўскім бокам успрымалася як знявага.

Аналізуючы здабытую інфармацыю, як падаецца, можна пагадзіцца з меркаваннем Э. Д. Банёніса, які лічыў, што ўлады ВКЛ, сутыкнуўшыся з жорстка рэгламентаваным маскоўскім дыпламатычным цырыманіялам, імкнуліся супрацьпаставіць яму падобны ж. Аднак ліцвінскі дыпламатычны цырыманіял не меў такога дакладна выражанага ідэалагічнага зместу, як маскоўскі, адставалі і арганізацыйныя моманты [1, с. 15].

Падводзячы высновы, можна адзначыць, што ліцвінскія дыпламаты займалі пасіўную пазіцыю ў пытаннях цырыманіялу. Адстойваючы свае пазіцыі ў пратакольных пытаннях яны, як правіла, спасылаліся не на пэўныя тэарэтычныя ці ідэйныя ўстаноўкі, як гэта рабіў маскоўскі бок, а на досыць прымітыўную аргументацыю тыпу “як вы з намі, так і мы з вамі”, або на традыцыі і звычаі. Дробныя канфлікты цырыманіяльнага характару часта

Библиотека БГУИР

пазбаўлялі ліцвінаў ініцыятывы, прымушалі падстройвацца пад маскоўскія нормы, ідэі і прапановы, дэманструючы слабасць і непрынцыповасць пры адстойванні ўласных інтарэсаў.

Літаратура

1. Банёнис, Э.Д. Посольская служба Великого Княжества Литовского (середина XV в.-1569 г.): автореф. дис….канд. историч. наук: 00. 07. 02 / Э.Д. Банёнис; Институт истории АН Литвы. – Вильнюс, 1982. – 21 с.

2. “Выписка из посольских книг“ о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487–1572гг.// Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. – Москва-Варшава: Археографический центр, 1997. – Т. 2. – 330 с.

3. Индова, Е.И. Русская посольская служба в конце XV – первой половине XVI в. / Е.И. Индова // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе: Сборник статей, посвященных Л. В. Черепнину. – М.: Наука, 1972. – С. 294–311.

4. Ключевский, В.О. Сказания иностранцев о Московском государстве/ В.О. Ключевский. – М.: Прометей, 1991. – 334 с.

5. Мікалаева, Л.В. Арганізацыя знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст.: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02/ Л.В. Мікалаева. – Мінск, 2003. – 108 л.

6. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1: 1487–1533 / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. - СПб.: Типография Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.

7. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 2: 1533–1560 / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Типография Ф. Елеонского, 1887. – Т. 59. – XV, 629, 95, VI с.

Библиотека БГУИР